# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА Т. А. МАРУДАВА



*Т. А. Марудаў. Кіраўнік падпольнай групы*

**Перыяд дзеяння**
з красавіка 1942 г. да чэрвеня 1944 г.

**Месца дзеяння**
чыгуначны раён г. Віцебска

**Колькасць**
19 чалавек

**Кіраўнікі**
Трафім Марудаў ("Федзя")

Дзейнічала з красавіка 1942 г. да чэрвеня 1944 г. Налічвала 19 чалавек. Кіраўнік Т. А. Марудаў («Федзя»). У красавіку 1942 г. Марудаў па заданні разведчыка М. А. Шпакава з армейскай разведгрупы Ю. С. Рудакова («Жорж», «Ягор») стварыў у горадзе падпольную групу, у якую ўвайшлі былыя ваеннапалонныя М. Е. Станкееў («Бялоў»), Г. М. Озераў, А. П. Скуман («Косця»), мясцовыя жыхары Н. Ф. Лынчанка («Цёця Маша»), В. В. Батаноўская, М. М. Бараноўская («Бабуля Шура»), Э. В. Бараноўская («Зоя»), А. Е. Словас, В. П. Марудава, М. І. Гарадзецкая, Л. П. Цыганова («Галя») і інш. Сувязнымі былі дзеці Лынчанка – Коля, Дзіна і Эма, Галя Марудава. Сувязь са спецгрупай Рудакова ажыццяўлялася праз Н. Ф. Лынчанка, сувязных спецгрупы Е. С. Спірыдонаву (Піражкову) і Паўліка Сакалоўскага. Звесткі з в. Загор'е ад Скумана прыносіла яго пляменніца Ала Аўсеева. Стрэлачнік Озераў, сцэпшчык вагонаў Словас, М. М. Бараноўская і Скуман назіралі за перавозкамі па чыгунцы. Станкееў збіраў звесткі аб умацаваннях праціўніка на левым беразе Віцьбы па Смаленскай шашы.

У жніўні 1942 г. ён быў арыштаваны і накіраваны ў лагер ваеннапалонных. Там ён выявіў групу варожых лазутчыкаў, якіх падрыхтавалі для засылкі ў савецкі тыл, дзе яны былі абясшкоджаны. Ваганава, якая працавала на хлебазаводзе, дапамагала вызначаць прыбываючыя ў горад вайсковыя часці. Э. В. Бараноўская ў маі 1942 г. уладкавалася рахункаводам у кантору гарнізоннага склада, які меў аддзяленні ў Гарадку, Лёзна, Невелі. Праз яе праходзілі ведамасці на выдачу харчавання і фуражу воінскім часцям, у якіх пазначаліся нумар часці і месца размяшчэння, колькасць людзей і коней. У сакавіку 1943 г. яна здабыла звесткі аб размяшчэнні 3-й танкавай арміі і іншых злучэннях праціўніка. Сястра Бараноўскай Вікторыя і іх цётка Марыя Мікалаеўна з акна сваёй кватэры сачылі за рухам па чыгунцы на Смаленск і ў зваротным кірунку.

У лютым 1943 г. арыштаваны і закатаваны Г. М. Озераў і Н. Ф. Лынчанка, Паўлік Сакалоўскі, у кастрычніку адпраўлены ў канцлагер і Марудаў. Групу ўзначаліла Э. В. Бараноўская. Уладкаваўшыся прыбіральшчыцай у кантору сувязі, яна вывучала сістэму сувязі ворага і перадавала звесткі ў спецгрупу. Сем'і Бараноўскіх і Марудавых заставаліся ў горадзе да вызвалення.

13 чалавек з групы атрымалі дзяржаўныя ўзнагароды.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група Т. А. Марудава / Н. І. Дарафеенка // Памяць : Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн. : БелЭн, 2002. — Кн. 1. — С. 492—493.
2. **Подпольная** группа Морудова Т. А. // Витебск : энциклопедический справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. — Мн. : БелСЭ им. П. Бровки, 1988. — С. 291—292.